УДК 81

# ФРАЗЕАЛАГІЗМЫ ЯК АДЗІН СА СРОДКАЎ ПАЭТЫЗАЦЫІ СВЕТУ ДЗЯЦІНСТВА Ў ПАЭМЕ ЯКУБА КОЛАСА “НОВАЯ ЗЯМЛЯ”

***Д.А. Гардзейчук,*** *Х “А”клас*
*Кіраўнік –* ***Н.І. Куратнік,*** *настаўнік беларускай мовы і літаратуры*
***Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Гімназія №2 г. Пінска”***

У 2022 годзе адзначаецца 140-гадовы юбілей класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа, жыццёвы лёс якога самым цесным чынам быў звязаны з нашымі роднымі мясцінамі: вёскай Пінкавічы і горадам Пінскам, дзе малады пісьменнік працаваў настаўнікам. Акрамя гэтага, на ўроках беларускай літаратуры ў 5 і 7 класе мы вывучалі такія раздзелы з паэмы “Новая зямля”, як “На рэчцы”, “Дарэктар”, “Дзядзька-кухар”, у якіх паэтам з вялікай любоўю створаны вабразы дзяцей. Знаёмства на ўроках беларускай мовы з тэмай “Фразеалогія” выклікала ў нас вялікую цікавасць, паколькі фразеалагізмы робяць нашу мову жывой і непаўторнай. Менавіта таму мы вырашылі даследаваць мастацка-выяўленчую ролю фразеалагічных адзінак у паэме Якуба Коласа “Новая зямля”.

**Мэта навуковай працы**: вызначэнне ролі фразеалагізмаў як моўных сродкаў, з дапамогай якіх пісьменнік стварае вобразы дзяцей, апісвае іх побыт, паказвае асаблівасці дзіцячай псіхалогіі.

Пастаўленая мэта прадугледжвае вырашэнне наступных **задач**:

знайсці і сістэматызаваць фразеалагізмы, выкарыстаныя аўтарам для стварэння вобразаў дзяцей;

з дапамогай фразеалагічных слоўнікаў высветліць іх лексічнае значэнне;

вызначыць структурныя і лексіка-граматычныя разрады фразеалагічных адзінак, выяўленых у дадзенай паэме;

суаднесці фраземы з адпаведнымі членамі сказа;

высветліць, фразеалагізмы якіх стылістычных разрадаў часцей за ўсё сустракаюцца ў творы;

вызначыць ролю дадзеных устойлівых спалучэнняў у мове аўтара і ў мове персанажаў.

**Аб’ект даследавання** – паэма Якуба Коласа “Новая зямля”.

**Прадмет даследавання** – фразеалагізмы як моўныя сродкі, з дапамогай якіх аўтар стварае вобразы дзяцей у паэме.

У ходзе дадзенага навуковага даследавання намі даказвалася **гіпотэза** аб тым, што фразеалагічныя адзінкі з’яўляюцца неад’емнай часткай вобразна-выяўленчых сродкаў твора і дапамагаюць Якубу Коласу паэтызаваць свет дзяцінства ў паэме “Новая зямля”.

У ходзе дадзенага навуковага даследавання мы аналізавалі тыя раздзелы паэмы Якуба Коласа “Новая зямля”, у якіх галоўнымі або другараднымі героямі з’яўляюцца дзеці.

У прааналізаваных раздзелах паэмы налічваецца каля 60 фразеалагізмаў, якія дапамагаюць аўтару паказаць побыт вясковых дзяцей у канцы 19 стагоддзя, расказаць пра адметнасць іх выхавання і вучобы ў хатняга настаўніка – дарэктара: *падпілуюць рогі, браць на розум, спусціць скуру, хварэць на пана* і інш. Менавіта з дапамогай фразеалагізмаў Якуб Колас змог лаканічна і вобразна апісаць асаблівасці ўзаемаадносін дзяцей у вялікай сям’і, расказаць пра іх адносіны са старэйшымі і пазнанне навакольнага свету: *усім кагалам, плячо ў плячо, таўчэцца пад нагамі, хоць кладзі да раны.* Фразеалагічныя адзінкі дапамагаюць аўтару паэмы перадаць душэўны стан персанажаў, служаць сродкамі іх знешняй характарыстыкі: *душа ў пяткі, як гара з плячэй скацілась, з вузел, майстар на ўсе рукі* і інш.

Адным з накірункаў нашага даследавання была адпаведнасць выкарыстаных у паэме фразеалагічных адзінак членам сказа. Значная частка прааналізаваных фразеалагізмаў адпавядае акалічнасці. Дадзеныя фраземы абазначаюць месца, час, спосаб дзеяння і: *хоць вушы затыкай, усім ка-*

*галам, у момант вока, плячо ў плячо* і іншыя. Такая ж шматлікая група фразеалагізмаў адпавядае выказніку, пры гэтым усе ўстойлівыя выразы абазначаюць дзеянне прадмета: *падпілаваць рогі – уціхамірыць, разрывацца на кавалкі – старацца, зямлі не чуць пад сабою – радавацц* і г. д. У творы сустракаюцца асобныя выпадкі ўжывання фразеалагізмаў, якія адпавядаюць дзейніку і зваротку.

Выкарыстаныя Якубам Коласам фразеалагічныя адзінкі даследаваліся і з пункту гледжання іх адпаведнасці часцінам мовы. Большая частка гэтых фразем адпавядае дзеяслову: *таўчэцца пад нагамі – перашкаджае, на руках насіць – паважаць, любіць, ад'ядаць сэрца – хваляваць* і г. д. Такую ж шматлікую групу складаюць фразеалагізмы, якія адпавядаюць прыслоўю: *без меры – многа, у адно слова – разам, шыта-крыта – скрытна, патаемна,* і г. д.

Прааналізаваныя намі фразеалагізмы маюць разнастайную будову: дзеяслоў + назоўнік (*спусціць скуру, язык развязаць* і інш.); дзеяслоў + назоўнік з праназоўнікам (*браць на розум, насіць на руках,* і інш.); назоўнік + назоўнік з прыназоўнікам (*з вузел ростам, у момант вока* і інш.); назоўнік з прыназоўнікам + лічэбнік (*у адзін момант, за адным разам*). Іншыя з'яўляюцца спалучэннем самастойных і службовых часцін мовы: *ні слова, ні зыку, на сэрцы, як бачыш, без меры* і інш. У паэме ёсць нешматлікая група фразеалагізмаў, якія маюць структурную будову сказа: *зямлі не чуеш пад сабою, як гара з плячэй скацілася.*

Фразеалагічныя адзінкі аналізаваліся намі і з пункту гледжання іх стылістычнай прыналежнасці. Мы прыйшлі да вываду, што сярод іх пераважаюць размоўныя фразеалагізмы, сустракаюцца асобныя выпадкі ўжывання міжстылёвых і прастамоўных фразем.

На нашу думку, праведзенае даследаванне з'яўляецца актуальным, паколькі яно дазваляе нам яшчэ раз далучыцца да беларускай літаратуры і культуры, даведацца аб асаблівасцях укладу жыцця нашых продкаў, пазнаёміцца з нацыянальнымі традыцыямі выхавання і навучання дзяцей. Акрамя гэтага, абраная тэма садзейнічала павышэнню ўзроўню моўнай культуры, дзякуючы папаўненню нашага лексічнага запасу фразеалагізмамі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Аксамітаў, А. С. Беларуская фразеалогія / А. С. Аксамітаў. – Мінск: Народная асвета, 1978.

2. Беларуская мова: Энцыклапедыя. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1994.

3. Гаўрош, Н. В. і іншыя. Фразеалагічны слоўнік для сярэдняй школы / Н. В. Гаўрош і іншыя. – Мінск: Народная асвета, 1973.

4. Колас, Я. Новая зямля. Сымон-музыка: Паэмы / Я. Колас. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1986.

5. Лепешаў, І. Я. Фразеалогія сучаснай беларускай мовы / І. Я. Лепешаў. – Мінск: Народная асвета, 1998.

6. Лепешаў, І. Я. Фразеалагічны слоўнік сучаснай беларускай мовы. Т. 1 – 2 / І. Я. Лепешаў. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1993.

7. Ляшук, В. Я. Вывучэнне творчасці Якуба Коласа ў школе / В. Я. Ляшук. – Мінск: Аверсэв, 2006.

8. Міцкевіч, Д. "Дзяцей, як тых снапкоў на току!.." / Д. Міцкевіч // Роднае слова. – 1995. – № 10.

9. Навуменка, І. Я. Якуб Колас: Нарыс жыцця і творчасці / І. Я. Навуменка. – Мінск: Народная асвета, 1982.

10. Навуменка, І. Я. Якуб Колас: Духоўны воблік героя / І. Я. Навуменка. – Мінск: Выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна, 1981.